

Нефармат

# РАМОНКАВЫ ЛУГ ПАДАРЫ НА ЎСПАМІН

Два разы ўжо прачытала матэрыял калегі Маргарыты Ушкевіч «На дарагі ўспамін», розныя думкі агортваюць, меркаванні ўзнікаюць, часам яны супярэчаць адно аднаму і зноў прымушаюць разважаць. Сапраўды, складаная сітуацыя, і не нам асуджаць таго чалавека, які ўсе свае зберажэнні, ды і не толькі іх, уклаў у незвычайны манумент на магіле любімай жонкі...

У яго, пэўна, свая праўда і свае правы. Падобна, ім кіравала імкненне зрабіць помнік, які прыцягваў бы ўвагу любога мінака. Паводле яго меркавання, чалавек абавязкова спыніцца, пастаіць, тым самым памяне яго любую жонку. Толькі вось ці так станецца? Падаецца, што тым, хто яе не ведаў пры жыцці, будзе і не надта цікавая асоба жанчыны, якая ўвекавечана, хай і нетыпова. Ды і помнік стаіць да не ў скверы альбо на вуліцы, а на могілках. А туды ідуць людзі, як правіла, са сваім успамінам. Хоць помнік з абрысамі Каложы не пакідае сумнення ў тым, што муж уклаў у яго стварэнне ўсю сваю любоў.

Гэта невясёлая гісторыя гродзенцаў абудзіла ў мяне ўспамін пра іншую гісторыю, пачутую многа гадоў таму на Піншчыне. І, што важна, з першых вуснаў. Пашчасціла тады пазнаёміцца з вельмі цікавым чалавекам, гэткім селянінам-інтэлігентам Рыгорам Максімавічам Бондзічам. Калі 82-гадовы гаспадар запрасіў да сябе ў хату — было гэта ў вёсцы Ганчары, — давялося нямала падзівіцца парадку, які ён падтрымлівае ў доме і ў двары сваімі рукамі. Сказаў, што гэта ў памяць пра яе, яго Марыю Міхайлаўну, з якой разам пражылі 51 год. Летам двор патанае ў кветках, бо «яна так любіла».

А яшчэ Рыгор Максімавіч расказаў і паказаў, які падарунак пры жыцці зрабіў жонцы. Вось сціслы пераказ яго доўгага расповеду: «Гадоў дваццаць таму сядзелі мы на вуліцы, а яна раптам кажа: «Ты па ўсёй акрузе цэрквы будуеш. Зрабіў бы і мне царкоўку вось тут, а то далёка хадзіць у Ахова». Спачатку ўспрыняў гэта як жарт. Нідзе не чуў, каб людзі ў сваім двары цэрквы ўзводзілі. А жонка на сваім настойвала: у агародзе цэгла ляжыць са старой разабранай пабудовы, вось табе і матэрыял. Стаў пярэчыць, маўляў, таго, што ёсць, не хопіць. А яна паказала на неба, у сэнсе Бог дапаможа ў добрай справе. Так яно ўрэшце і выйшла».

У справе пабудовы храмаў ён меў багаты вопыт. Па некалькі месяцаў працаваў на ўзвядзенні цэркваў у Жыткавічах, у вёсцы Махро Іванаўскага раёна, у іншых сёлах. Быў там і за цесляра, і за галоўнага кансультанта, тлумачыў іншым майстрам, як рабіць усё па канонах. Ну і рызыкнуў паўтарыць пабудову ў мініяцюры. Пакуль рабіў падмурак, сцены, на пытанні цікаўных суседзяў адказваў: «Лазню будую». Баяўся прызнавацца, у часы дзяржаўнага атэізму ўсякае магло здарыцца. А калі пачалі ўгадвацца абрысы будынка і суседзі здагадаліся, што будзе ў агародзе ў Бондзічаў, то сталі прапаноўваць сваю дапамогу. Але ён адмовіўся, вырашыў, што гэты храм павінен пабудаваць сам, ад пачатку да канца.

І ў 1990 годзе белую цэркаўку з сінімі купаламі ён падарыў сваёй любай Марыі. Па памерах царква і сапраўды не нашмат большая за лазню. Але ўсё там зроблена і ўладкавана як у сапраўдным храме: і алтар, і абразы, і свечкі. Парадак і прыгажосць былі наведзены клапатлівай рукой гаспадыні. У свой час царкву асвяціў епіскап Пінскі і Лунінецкі Стэфаній у гонар Успення Божай Маці. А Мітрапаліт Філарэт уручыў Рыгору Максімавічу ордэн Прападобнага Сергія Раданежскага. Царква тая паслужыла не адзін год ім і аднавяскоўцам. Святар прыязджаў па вялікіх святах у іх сямейную царкву, і там збіраліся ледзь не ўсе жыхары Ганчароў.

Рыгор Бондзіч казаў тады мне, што царква цяпер для яго нібы помнік жонцы. З часам яна стала помнікам для іх дваіх. Кажуць, што дзеці і ўнукі падтрымліваюць дзедаву цэркаўку, а значыць, берагуць памяць пра дзядулю і бабулю, гісторыю іх набожнасці і трапятлівых адносін адно да аднаго.

...Вядома, не кожны можа зрабіць падарунак сваёй палавіне альбо сваёй каханай, які б застаўся на гады, а можа, дзесяцігоддзі. Але кожны можа дарыць шчаслівыя імгненні, што неўзабаве стануць успамінамі, бо нічога, відаць, няма лепшага за светлы ўспамін. Не ведаю, ці ўсведамлялі гэта тыя двое, якіх мы аднойчы ўбачылі сярод рамонкаў. Мы ехалі нядаўна з маёй новай расійскай знаёмай у вёску. Яна звярнула ўвагу і спытала: «А што, тут хіба кліп здымаюць?» Толькі здымачнай групы ў ваколіцах не назіралася. А двое, па выглядзе гадоў васямнаццаці, бегалі па тых бясконцых рамонках і нават тэлефон перад сабой не трымалі, як гэта ў іх цяпер прынята. Яны так былі заняты сабой, сваім смехам, сваёй радасцю, што пра тэлефоны, пэўна, забыліся. Падалося, яны былі вельмі шчаслівыя.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

## Даты Падзеі Людзі

### 1 ЛІПЕНЯ

У краіне

**1569** год — Люблінскай уніяй створана Рэч Паспалітая — акт федэрацыйнага аб'яднання дзвюх дзяржаў, Польшчы і Вялікага Княства Літоўскага, у Рэч Паспалітую абодвух народаў, зацверджаны на Люблінскім сейме. Унія была абумоўлена напярэдняй гісторыяй дзяржаўных зносін Польшчы і ВКЛ і прыспешана цяжкім становішчам ВКЛ у Лівонскай вайне.

**1926** год — у Пінску адкрыты Музей Беларускага Палесся. У экспазіцыі знаходзяцца прадметы старадаўняй мэблі, музычныя інструменты, гадзіннікі, посуд, адзенне, унікальная калекцыя керамічнай пліткі і саркафаг XII ст., калекцыя зброі, дакументы і кнігі (рукапісныя граматы XIV—XVII стст., Статут Вялікага Княства Літоўскага, надрукаваны ў Вільні ў 1694 годзе. У фондзе музея знаходзяцца карціны мастакоў І. Шышкіна, В. Паленава, В. Пярова, Ю. Пэна, В. Цвіркі, П. Масленікава. У зале Вялікай Айчыннай вайны дэвалецца аб стварэнні аднаго з першых у Беларусі партызанскіх атрадаў.

**1941** год — на Заходнім фронце на подступах да ракі Бярэзіны і Бабруйска прынялі баявое хрышчэнне савецкія самалёты-штурмавікі Іл-2 (самы масавы самалёт часоў Другой сусветнай вайны).

**1951** год — нарадзіўся (в. Вотня Быхаўскага раёна) Аляксандр Міхайлавіч Радзькоў, доктар педагагічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь, вядомы палітычны і дзяржаўны дзеяч краіны. У 1973 годзе скончыў Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут, дзе з 1974 да 1997 года прайшоў шлях ад асістэнта кафедры да першага прарэктара. У 1997—2001 гадах — першы прарэктар, а ў 2001—2003-м — рэктар Магілёўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Са жніўня 2003 года — міністр адукацыі Рэспублікі Беларусь. У снежні 2010 года прызначаны першым намеснікам кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Старшыня РГА «Белая Русь» (2007—2017 гады).



У свеце

**1646** год — нарадзіўся Готфрыд Вільгельм Лейбніц, нямецкі філосаф, асветнік, вучоны-энцыклапедыст. Адзін са стваральнікаў дыферэнцыяльнага і інтэгральнага вылічэнняў, якія мелі важнае значэнне для далейшага развіцця матэматыкі і прыродазнаўства.

**1859** год — у Пратаколах лонданскага Лінэеўскага таварыства ўпершыню апублікаваны кароткі выклад гіпотэзы натуральнага адбору Чарльза Дарвіна.

**1877** год — пачаўся першы Уімблдонскі тэнісны турнір. Разыгрывалася першынство спачатку толькі сярод мужчын. Першым пераможцам стаў Спэнсэр Гор. За праваназірацца фінальную гульню гледачы плацілі адзін шылінг.

Так гаварыў...

**СЕРВАНТЭС:**

*«Лепш чырвань на твары, чым пляма на сэрцы».*

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.42 | 21.44 | 17.02 |
| Віцебск — | 4.23 | 21.42 | 17.19 |
| Магілёў — | 4.30 | 21.35 | 17.05 |
| Гомель — | 4.38 | 21.22 | 16.44 |
| Гродна — | 4.59 | 21.58 | 16.59 |
| Брэст — | 5.09 | 21.49 | 16.40 |

### Месяц

*Поўня 24 чэрвеня.*
*Месяц у сузор'і Авена.*

### Імяніны

*Пр. Аляксандра, Васіля, Лявонція, Сяргея.*
*К. Галіны, Рэгіны, Марціна, Юльяна.*



Фота Максіма ШАСТАКОВА.

## ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

— А што азначае, калі ў дзяўчыны на руцэ звычайны пярсцёнак?

— Гэта нічога не азначае.

— А што азначае, калі ў дзяўчыны на руцэ заручальны пярсцёнак?

— Гэта азначае, што яна замужам.

— А што азначае, калі ў дзяўчыны на руцэ і заручальны, і звычайны пярсцёнак?

— Гэта азначае, што яна замужам, але гэта нічога не азначае.




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Передрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 1873.

Нумар падпісаны ў 19.30 30 чэрвеня 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12